# З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ!

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 12(894) | ПЯТНІЦА, 1 верасня 1995 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ЦІ ПАРАДУЕ СЁЛЕТА ДЗЕНЬ ВЕДАЎ?

Святы сёння ў нашым жыцці не такая ўжо і частая з'ява. У календары іх можа яшчэ і нямала. А вось душой мы іх даўно не адчуваем. Няма ранейшай узнёсласці і радасці, бо бачыш, што навокал адны праблемы і вырашэнне іх надыдзе невядома калі.

Вось і сёння -- на календары пазначана: Дзень ведаў. А гэта значыць, што мільёны хлопчыкаў і дзяўчынак, падлеткаў, моладзь пачынаюць і працягваюць шлях да адукацыі, навукі. І чым падмацоўваецца іх жаданне папаўняць свой багаж ведаў? Матэрыяльна наша дзяржава цяпер не ў стане іх забяспечыць: добрых падручнікаў не хапае, купіць агульны сшытак, дзённік -- таксама праблема, а каб поўнасцю "экіпіраваць" першакласніка, вучня ў школу, бацькам можа не хапіць іх месячных зарплат. Праблем не менш і ў студэнцкай моладзі.

Дык ці радавацца нам такім святам?

## АДЗНАЧЫМ У ДРУГІ РАЗ

У нядзелю, 3 верасня -- Дзень беларускага пісьменства і друку. Гэтае свята сёлета будзе адзначацца ў нашай рэспубліцы ў другі раз. Асноўныя ўрачыстасці, прысвечаныя яму, адбудуцца ў старажытным Тураве.

Да гэтай даты прымеркавана выстава навуковай кнігі і перыядычных выданняў, якая будзе працаваць сёння на філалагічным факультэце.

# НОВЫ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫ САВЕТ: ПЕРШАЯ АБАРОНА

Гомельская алгебраічная школа, створаная вучнем О.Ю.Шмідта акадэмікам С.А.Чуніхіным і ўзначальваемая цяпер членам-карэспандэнтам АН Беларусі рэктарам нашага універсітэта прафесарам Л.А.Шамятковым, шырока вядомая навукоўцам не толькі ў краінах СНД, але і за іх межамі. Яна стала сапраўднай кузняй па падрыхтоўцы вучоных у важнай галіне матэматыкі. Яе выхаванцамі з'яўляюцца 5 доктараў і звыш 50 кандыдатаў фізіка-матэматычных навук. Многія з іх працуюць у Гомельскім дзяржуніверсітэце і плённую выкладчыцкую дзейнасць актыўна спалучаюць з навукова-даследчай. Высокі навуковы патэнцыял гомельскіх алгебраістаў дазволіў адкрыць у гэтым годзе пры ГДУ спецыялізаваны савет па абароне доктарскіх дысертацый.

Першую і даволі яркую старонку ў яго гісторыю упісаў 36-гадовы кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі С.Ф.Каморнікаў. Ён бліскуча абараніў доктарскую дысертацыю "Субнармальныя падгрупы ў тэорыі фармацыі канечных груп". Яго дысертацыі дадзена высокая адзнака ў знешнім водзыве Інстытута матэматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Украіны, апанентамі доктарамі фізіка-матэматычных навук прафесарамі В.А.Вядзернікавым (Бранск), А.С.Кандрацьевым (Екацерынбург), І.У.Пратасавым (Кіеў). Станоўчыя водзывы на доктарскую дысертацыю С.Ф.Каморнікава прыслалі таксама прафесары О.Кегель і К. Дзёрк з Германіі.



**Б.ВАЛОДЗІН.**

**На здымку: дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук абараняе дацэнт С.Ф.Каморнікаў.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

- 1 Ці прыносяць святы задавальненне? Доктарскія дысертацыі абараняюць у ГДУ.
- 2 Абмеркавалі прафсаюзныя лідэры. Апладыравалі шатландцы.
- 3-4-5 Конкурсная барацьба і яе пераможцы.
- 6 Весткі з замежжа. Слова да першакурснікаў.
- 7 На подступах да Алімпіяды.
- 8 Аб розным.

# ПРАФСАЮЗ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ: ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

Пад такой назвай прэзідыум Савета старшынь прафкомаў універсітэтаў правёў ў Маскве сумесна з Аб'яднаным прафкомам Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта чарговую VII нараду Савета старшынь прафкомаў універсітэтаў і навукова-практычны семінар.

Нагадаем, што ўжо 8 гадоў існуе Савет старшынь прафкомаў універсітэтаў былога СССР, а цяпер краін СНД, мэтай якога з'яўляецца каардынацыя дзеянняў прафсаюзных арганізацый пры вырашэнні ўсіх надзённых задач. Уваходзіць у яго і наш універсітэт. Савет працягвае плённа працаваць, нягледзячы на разарваныя эканамічныя сувязі паміж былымі саюзнымі рэспублікамі, імкнецца сумеснымі намаганнямі вырашаць праблемы універсітэцкага жыцця.

На чарговы семінар-нараду з'ехаліся старшыні прафкомаў 12-ці універсітэтаў краін СНД. Нашу дзяржаву на ім прадстаўляў ГДУ ў асобе старшынь прафкомаў Г.І.Варатніцкага і Н.І.Колтышавай, якія прынялі актыўны ўдзел у абмеркаванні разглядаемых на ёй пытанняў. А яны датычыліся ўдзелу прафсаюза ў кіраванні універсітэтам, вопыту заключэння калектыўнага дагавору ва універсітэце, адносін прафсаюза да раздзяржаўлення вышэйшых навучальных установ у СНД, праблем захавання сацыяльнай сферы ў ВНУ. Абмяркоўваліся таксама вопыт прыцягнення пазабюджэтных і мэтавых сродкаў адміністрацыяй і прафкомамі універсітэтаў, сістэмы сацыяльнага і медыцынскага страхавання, а таксама тэндэнцыі ў прафсаюзным руху краін СНД.

Як ў ранейшы, так і ў цяперашні час праблемы ва ўсіх вузаўскіх прафсаюзных арганізацыях застаюцца агульнымі. Гэта слабая матэрыяльная база, недахоп вучэбнай літаратуры, невялікі памер студэнцкай стыпендыі, немагчымасць належнай арганізацыі вольнага часу студэнцкай моладзі і інш. Таму на семінары яе ўдзельнікамі былі выпрацаваны рэкамендацыі для практычнай работы, агавораны асноўныя палажэнні калектыўнага дагавора як асноўнага дакумента па сацыяльнай абароне выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў у ВНУ, узняты пытанні, якія патрабуюць вырашэння на ўзроўні ўрада.

**Т.ДУБЯК.**

**Нашы -- за мяжой**

# "ДЗЯННІЦА" У ГОРАДЗЕ АБЕРДЗІНЕ

Абердзін -- горад-кветка, які стварылі самі яго жыхары. Разнастайнасць поглядаў, жаданне збіраць не толькі грошы, але ў асноўным уражанні, дапамагаюць ім дзіўна і прыгожа праводзіць масавыя гулянні, святы, інтэрнацыянальныя фестывалі і канферэнцыі.

Капэла ГДУ "Дзянніца" пад кіраўніцтвам Мікалая Казлова была ўключана ў праграму Абердзінскага інтэрнацыянальнага маладёжнага фестывалю з хорамі дэлегацый г.Абердзіна, Чэхіі, Нарвегіі, Зімбабве. Кожны з гэтых хораў самастойна выконваў гімн сваёй краіны, разам выконвалі гімны Азербайджана, Фінляндыі, Венгрыі, Ірландыі, Украіны, Галандыі. Гімн Расіі іграў аркестр, а ў заключэнне ўсе хоры і зала спявалі гімн усіх студэнтаў свету -- Гаудэамус.

Гэтыя ж хоры штодзённа рэпеціравалі да закрыцця фестывалю частку музычнага твора Keніса Лейтана "Гімн матэрыі", які быў добра прыняты публікай.

Нам пашчасціла пазнаёміцца і працаваць з цудоўным дырыжорам Крыстоферам Белам, які сабраў ў адно цэлае не толькі музыку, але і галасы ўсіх выканаўцаў зводнага хору. Калі ў яго гэта атрымалася, ён усклікнуў: "Фантастыка"!



Капэла ў фестывальныя дні (1-12 жніўня) працавала па строгаму плану, дзе кожнай падзеі адводзіўся час па 15, 30, 45 мінут. Усе сістэмы былі арганізаваны дакладна: транспарт, абслугоўванне, інфармацыя, канцэрты, музеі, тэатры, прыёмы, харчаванне, экскурсіі, адпачынак.

Сольныя канцэрты капэла дала ў прэстыжных залах г. Абердзіна. Мы выступалі ў Мітчэл холе (**на здымку**), мемарыяльным цэнтры Караля Георга V, Артгалерэі, двойчы на пляцоўцы цэнтральнага універмага. Некалькі канцэртаў былі арганізаваны ў храмах у наваколлі г.Абердзіна. Прымалі нас усюды вельмі цёпла. На біс выконваліся ў храмах "Аве Марыя", на іншых пляцоўках -- "Там каля млына" і "Калінка".

Па шляху да месца канцэртаў экскурсаводы знаёмілі нас з жыццём шатландцаў, ды і мы глядзелі на добраўпарадкаваныя палі і пашы, сытых кароў і авечак, верасковыя заравнікі, старажытныя замкі, патанаючыя ў кветках домікі простых людзей, якія не страчваюць інтарэсу і вынаходзяць новыя прыстасаванні, каб паліваць кветкі на фанарных слупах сваіх вуліц.

Бачылі мы, што жывыя яшчэ браты-трусы, знаёмыя нам па кнігах класікаў. Канешне, яны жывуць не ў г.Абердзіне, а ў 50-60 км ад яго -- гэта іх зона і яны з задавальненнем, а часам і са спалохам выглядаюць з нораў, каб паглядзець на харыстак з г.Гомеля. А мы, разглядаючы новы край з вакон камфартабельнага аўтобуса, бачылі прыклады рацыянальнага выкарыстання зямлі, беражлівых адносін да яе багаццяў і новыя тэхналогіі, якія не забруджваюць прыроду.

Усяго капэла дала ў Еўропе 21 канцэрт і нават адзін на мытні, каб не затрымлівацца на ёй, як камерсанты, і задаволеная вярнулася ў свой родны Гомель і універсітэт, дзе "Дзянніцу", на жаль, ведаюць менш, чым у Шатландыі.

**Э.ЛІЗАРАВА,**
**альт капэлы "Дзянніца".**





Рэктар універсітэта Л.А.Шамяткоў у прысутнасці прадстаўніка адміністрацыі Прэзідэнта старшыні Беларускай дзяржаўнай телерадыёкампаніі Р.Л.Кісяля ўскрывае канверт з тэкстам дыктоўкі па беларускай мове.



Дыктоўку дыктуе старшы выкладчык кафедры беларускай мовы А.М.Краснова.

*Да вынікаў уступных экзаменаў-95*

# ЗА ПРАВА СТУДЭНТАМІ ЗВАЦЦА

## КОНКУРС ЗНІЗІЎСЯ

За ўсе 26 гадоў існаванння нашага універсітэта яшчэ не было выпадку невыканання планавага набору першакурснікаў. Ніколі не адчувалася недахопу ў абітурыентах. Не сталі выключэннем і сёлетнія выпрабаванні для жадаючых вучыцца ў ГДУ. З улікам 96-ці выпускнікоў падрыхтоўчага аддзялення, якія ўпершыню ўдзельнічалі ў агульным конкурсе, прыёмная камісія прыняла дакументы ад 1757 чалавек. Шчаслівучыкамі маглі стаць толькі 925 з іх. Менавіта столькі планавых месц зацвердзіла нам Міністэрства адукацыі і навукі - на 25 больш, чым летась. На кожнае з іх прэтэндавала 1.9 абітурыента. Гэта на 0.5 менш,чым было ў мінулым годзе, самым высока-конкурсным у гісторыі універсітэта. Прычына адтоку, на нашу думку, па - першае, ў пэўным падзенні прэстыжнасці вышэйшай адукацыі, калі не ўсе выпускнікі ВНУ атрымоўваюць накіраванні для працаўладкавання. Па-другое, у пашырэнні сеткі вышэйшых навучальных установ і, у прыватнасці, недзяржаўных, у дэмаграфічных асаблівасцях.

Набор першакурснікаў ва універсітэт сёлета ажыццяўляўся на 26 спецыяльнасцей. Адна з іх новая: "Фізіка і тэхнічная творчасць" (педагагічнае аддзяленне). Пасля гадавога перапынку аднавіўся набор студэнтаў на спецыяльнасць "Эканамічная інфарматыка ". З бягучага года пачынаецца падрыхтоўка "чыстых" гісторыкаў і географаў. На адну са спецыяльнасцей -- "Англійская мова" -- павялічыўся набор на 25 чалавек. А вось на спараныя спецыяльнасці "Гісторыя і англійская мова ", "Гісторыя і нямецкая мова" ён на такую ж колькасць зменшыўся. Набралі адпаведна па падгрупе: 13 і 12 чалавек.

Якім жа быў конкурс па кожнай спецыяльнасці? Па чатырох -- вышэй мінулагодняга, па 15-ці -- ніжэйшым. Назавем канкрэтныя лічбы ( у дужках -- паказчык мінулага года): біяфак -- 1.4(2.6); матфак -- педпаток 1.5(1.7), прыкладная матэматыка --- 1.84 (2,2); фізічны факультэт: педпаток -- 1.1(1.6), вытворчае аддзяленне -- 1.44 (1.5), аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі -- 1.6 (2.2), фізіка і тэхнічная творчасць -- 1.1; філалагічны факультэт: руская мова і літаратура -- 3.36 (3.3), беларуская мова і літаратура -- 2.4 (3.3), руская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура -- 2.64(3.2), руская мова і літаратура і англійская мова -- 1.88(1.8), беларуская мова і літаратура і англійская мова -- 2.2(2.4), англійская мова -- 1.3(2.9), нямецкая мова -- 2.68(2.9). Лічбы эканомфака: эканоміка і кіраванне вытворчасцю -- 2.0(2.3), бухулік, аналіз і аўдыт -- 2.0(2.6), эканамічная інфарматыка -- 1.68.

З кожным годам узрастае прэстыж геолага-геаграфічнага факультэта. Сёлета на яго спецыяльнасці конкурс быў наступны: геалогія і разведка карысных выкапняў -- 2.36(1.7), геаграфія і англійская мова -- 1.8(2.4), геаграфія і нямецкая мова -- 2.16(1.7), геаграфія -- 1.8.

На гісторыка-юрыдычным факультэце самым высокім быў конкурс на спецыяльнасць "Гісторыя і англійская мова" -- 2.23(3.3), далей: гісторыя і нямецкая мова -- 2.0(1.7), правазнаўства -- 1.93(2.9), гісторыя -- 1.59.

З прыведзеных дадзеных бачна, што найбольшы адток абітурыентаў быў на біяфаку, педагагічным патоку фізічнага факультэта, спецыяльнасцях: "Правазнаўства", "Гісторыя і англійская мова".

Асаблівасцю сёлетніх уступных экзаменаў з'явілася значнае паніжэнне льгот для паступаючых (ліквідацыя пазаконкурснага залічэння выпускнікоў падрыхтоўчага аддзялення, для большасці спецыяльнасцей ліквідаваны льготы медалістам, была абмежавана папярэдняя здача экзаменаў і інш.).

**(Працяг на 4 і 5-й стар.)**

*Да вынікаў уступных экзаменаў-95*

(Працяг. Пачатак на 3-й стар.)

# ЗА ПРАВА СТУДЭНТАМІ ЗВАЦЦА

## НЕЗВЫЧАЙНЫ ПАЧАТАК

Менавіта такім ён быў на старце сёлетніх выпускных экзаменаў. Іх правядзенне, як вядома, узяў пад уласны кантроль першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка.Сваёй мэтай ён паставіў забяспечыць роўныя магчымасці для ўсёй моладзі, паступаючай ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя установы з тым, каб змаглі працягваць вучобу найбольш падрыхтаваныя юнакі і дзяўчаты. У наш універсітэт была накіравана камісія на чале з прадстаўніком адміністрацыі Прэзідэнта рэспублікі старшынёй Беларускай дзяржаўнай тэле-радыёкампаніі Р.Л.Кісялём, у якую ўваходзіў 21 кваліфікаваны спецыяліст па ўсіх дысцыплінах уступных экзаменаў. Яны строга сачылі, каб не было ніякіх парушэнняў.

А зараз вернемся да 17 ліпеня -- першага дня ўступных экзаменаў. Пра яго будуць успамінаць неадноўчы і тыя, хто дасягнуў пастаўленай мэты, і тыя, хто перажыў горыч няўдач.

З 9-ці гадзін раніцы абітурыенты з вялікай цікавасцю і хваляваннем глядзелі па тэлевізарах і слухалі зварот да іх Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі, які зачытаў у заключэнне тэмы сачыненняў па рускай мове (стаўшай другой дзяржаўнай) і літаратуры і беларускай мове і літаратуры, назваў адпаведныя нумары канвертаў з тэкстамі дыктовак.

Першы экзаменацыйны дзень у нашым універсітэце, скажам прама, некалькі засмуціў і ўстрывожыў. Маем на ўвазе абітурыентаў, якія паступалі на спецыяльнасць "Беларуская мова і літаратура" і пісалі дыктоўку па роднай мове. Дык вось 60% з іх "адсыпалася" пасля першага ж іспыту. Канешне, тут мелі месца псіхалагічная напружанасць, нават стрэсавая сітуацыя і некаторыя іншыя фактары. Разам з тым трэба прызнаць, што выкладанне беларускай мовы ў многіх школах вядзецца яшчэ на нізкім педагагічным узроўні. Гэта датычыцца і такіх дысцыплін, як матэматыка, гісторыя Беларусі, біялогія і некаторых іншых. Хаця зазначым, што з 1757 паступаючых ва універсітэт абітурыентаў амаль 90% мелі ў атэстатах сталасці, у дыпломах аб сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі толькі добрыя і выдатныя адзнакі.



Першы экзамен па геаграфіі Таццяна Жупікава здала на "выдатна". Яна стала студэнткай геолага-геаграфічнага факультэта.

І ўжо зусім недарэчна, калі "правальваюцца" медалісты. Сёлета з іх кагорты за "бартом" аказаўся 71 чалавек. Праўда, у працэнтных адносінах сёлета гэта менш, чым летась, на 12,4%.

## КАМУ ЎСПЫХНУЎ ЗЯЛЁНЫ СВЕТЛАФОР

Як адзначалася вышэй, пры залічэнні ва універсітэт сёлета льготнікаў было значна менш, чым у папярэднія гады. Ні адзін абітурыент не залічаны па субяседванню, якое наогул не праводзілася. Па-за конкурсам маглі паступіць 13 чалавек (паступіла 9) на педагагічныя спецыяльнасці з мэтавымі накіраваннямі. Галоўным крытэрыем адбору былі набраныя балы.

Якая ж колькасць балаў адкрыла дзверы ва універсітэт для сённяшніх першакурснікаў? Прыводзім дадзеныя ў параўнанні з мінулагоднімі. Самы высокі прахадны бал -- 14 -- аказаўся на спецыяльнасці "Гісторыя і англійская мова" (13) і "Геаграфія і англійская мова" (12). Неабходна было набраць 12 балаў, каб набываць спецыяльнасці: "Руская мова і літаратура і англійская мова" (10), "Руская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура" (11), "Беларуская мова і літаратура і англійская мова" (12), "Нямецкая мова" (11), "Гісторыя", "Гісторыя і нямецкая мова" (9), "Геаграфія", "Геаграфія і нямецкая мова" (11).

11-бальная сума стала пропускам у ГДУ на спецыяльнасці: "Руская мова і літаратура" (12), "Англійская мова" (15), "Матэматыка" (11), "Бухулік, аналіз і аўдыт" (12), "Эканоміка і кіраванне вытворчасцю" (12), "Эканамічная інфарматыка".

10 набраных балаў дазволілі набываць вышэйшую адукацыю ў ГДУ на спецыяльнасцях: "Беларуская мова і літаратура" (12), "Прыкладная матэматыка" (12), вытворчы паток фізічнага факультэта (9), "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі" (11).



Добрыя веды па біялогіі паказаў на ўступных экзаменах Уладзімір Папапенка. Ён залічаны на біялагічны факультэт.



Мінімальная колькасць балаў -- 9 -- забяспечыла месца ў нашым універсітэце тым, хто паступаў на біяфак, спецыяльнасці: "Фізіка і тэхнічная творчасць", "Геалогія і разведка карысных выкапняў" (9), педагагічнае аддзяленне фізічнага факультэта (9). Такі ж рубеж неабходна было пераадолець і абітурыентам факультэта фізічнай культуры. Зазначым, што сярод яго першакурснікаў -- чатыры майстры спорту міжнароднага класа і дзесяць майстроў спорту. Гэта своеасаблівы і вельмі прыемны рэкорд.

Асобна хочацца сказаць пра спецыяльнасць "Правазнаўства". Пры яе адкрыцці яна была, бадай, самай папулярнай ва універсітэце. Цяпер жа сітуацыя зусім іншая. Конкурс на яе рэзка ўпаў і дайшло да таго, што пры планавых 75-ці месцах на гэту спецыяльнасць сёлета недабрана 6 чалавек. З 38 медалістаў пры мінімальным 9-бальным конкурсе студэнцкія білеты атрымаюць толькі 28.

Калі не хапае патрэбных грунтоўных агульнаадукацыйных ведаў, месца ў аўдыторыях нашага універсітэта не зоймеш. Спатрэбіцца дадатковая падрыхтоўка і разлік на наступную спробу стаць студэнтам.



Дзе той шчаслівы білет?



Перад экзаменам.

## ДАВАЙЦЕ ЗНАЁМІЦЦА

● Ва універсітэт паступала 65% асоб цудоўнага полу і 35 -- моцнага. У своеасаблівым сапернiцтве перамога аказалася за першымі. Пасля залічэння суадносіны аказаліся наступнымі -- адпаведна 62 і 38%. Па-ранейшаму амаль чыста жаночым застаецца філалагічны факультэт. На яго першы курс набрана 227 дзяўчат і ўсяго толькі 24 юнакі. Таму жаночаму папаўненню гэтага факультэта трэба ўдзяліць асаблівую ўвагу. Не павінны праяўляць ганарыстасці і пераборлівасці студэнты факультэта фізічнай культуры, фізічнага і гісторыка-юрыдычнага факультэтаў, будучыя геолагі, дзе мужчынская палавіна пераважае.

● Ва універсітэт паступала 1745 абітурыентаў з Беларусі і 918 сталі яго студэнтамі. У родным горадзе хацелі вучыцца 941 гамяльчанін. 568 з іх -- 61,6% ад залічаных -- дасягнулі пастаўленай мэты. Дарэчы, студэнтамі нашага універсітэта ў папярэднім годзе сталі 554 маладыя жыхары горада над Сожам.

● З сельскай мясцовасці паступала 367 чалавек, конкурс прайшло 160.

● Сярод залічаных на першы курс пераважаюць дзеці служачых -- 558 чалавек, рабочых -- 351, што ж датычыць выхаванцаў калгасных сем'яў, іх па-ранейшаму вельмі мала -- усяго 14 чалавек.

● Найбольшая колькасць паступіўшых медалістаў ва універсітэт на спецыяльнасцях: "Англійская мова" -- 33, "Правазнаўства" -- 28, "Матэматыка" -- 25, "Біялогія і хімія" -- 24, ніводнага -- сярод будучых геолагаў.

● Сярод першакурснікаў -- 15 пераможцаў алімпіяд па дысцыплінах уступных экзаменаў, 10 -- чырвонадыпломнікаў з тэхнікумаў, і 1 -- з ПТВ, 12 ліцэістаў.

● 17 першакурснікаў маюць працоўны стаж па выбранай спецыяльнасці. 5 з іх паступілі на біяфак, 3 -- на факультэт фізічнай культуры.



Пазаконкурсныя выпрабаванні па плаванню ў абітурыентаў факультэта фізічнай культуры.

● 291 першакурснік закончыў падрыхтоўчыя курсы, 54 вучыліся ў спецкласах.

● Сёлетнім нашым папаўненнем сталі 768 беларусаў, 131 -- рускіх, 15 -- украінцаў, 9 чалавек -- іншых нацыянальнасцей.

Канешне, нельга з абсалютнай дакладнасцю сказаць, што ва універсітэт паступілі самыя падрыхтаваныя і дастойныя набываць вышэйшую адукацыю ў ГДУ. Але прыёмная камісія лічыць, і небеспадстаўна, што гэта так. Таму сёння першакурснікам вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся -- шчырыя віншаванні і найлепшыя пажаданні ад рэктарата, грамадскіх арганізацый, выкладчыкаў і шматтысячнай студэнцкай сям'і. Уліваецеся ў яе паўнапраўнымі членамі. Паспяховай вучобай, актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, плённым развіццём сваіх здольнасцей і талентаў абагачайце і памнажайце лепшыя традыцыі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

**Па справаздачных дадзеных прыёмнай камісіі ГДУ публікацыю падрыхтаваў У.БАЛОГА.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

# У БЕЛЬГІЮ -- ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ ФРАНЦУЗСКАЙ МОВЫ

У мінулым навучальным годзе са студэнтаў першага і другога курсаў спецыяльнасцей "Правазнаўства", "Эканоміка і кіраванне " была створана факультатыўная група для інтэнсіўнага вывучэння французскай мовы. Набытыя ва універсітэцкіх сценах веды пашчасціла замацаваць практычна ў Бельгіі. Тыя рабяты, якія здолелі своечасова аформіць замежныя пашпарты, на цэлы месяц выязджалі да сваіх заходнееўрапейскіх сяброў. Яны размясціліся ў Еўрапейскім цэнтры Бельгіі, які знаходзіцца ў 10 км ад граніцы з Францыяй у населеным пункце Олуа-Сюр-Віруа. На чале са старшым выкладчыкам кафедры нямецкай і французскай моў ГДУ В.В.Чэркасам заняткі па французскай мове з нашымі студэнтамі праводзілі вопытныя педагогі з бельгійскай сталіцы Бруселя і г.Льежа.

Вельмі цікава ў гасцей з Беларусі праходзіў вольны ад заняткаў час. Іх запрашалі ў сем"і мясцовых жыхароў, дзе адбылося шмат прыемных знаёмстваў. Прадставілася таксама магчымасць зрабіць незабыўную экскурсію ў прыгранічную Францыю.

**Наш кар.**

## У ГЕРМАНІІ -- БЕЗ ПРАБЛЕМ, ЯКІЯ Ў НАС НАДАКУЧЫЛІ

У чэрвені з групай дзяцей ад Гомельскага эндакрыналагічнага дыспансера я ў якасці перакладчыцы была ў Германіі. Мы жылі за горадам у доме мільянера Томаса Барта. У трохпавярховым асабняку нас жыло 18 чалавек. Умовы нашага пражывання аказаліся проста цудоўнымі, у распараджэнні былі: сауна, басейн, кухня, зусім не падобная на нашыя кухні, з пасудамыючай машынай, кававаркамі, міксерамі, тостэрамі. Рукамі там рабіць нічога не трэба. У доме жыў повар, які смачна гатаваў ежу і прымушаў дзяцей з"ядаць усё да канца, што было для іх не лёгка. Фруктамі ( бананы, апельсіны, ківі, вінаград) яны аб"еліся да таго, что ў канцы адпачынку недаедзеныя яблыкі і бананы можна было знайсці дзе пападзе. Былі ў нас і экскурсіі, якімі кіравала "управляющая делами" Томаса Ангеліка. Яна наймала ў пракатным бюро аўтобусы і машыны з вадзіцелем, і мы адпраўляліся ў падарожжы. Ездзілі ў Штутгарцкі заапарк, у некалькі старых гарадоў, пабывалі на пікніку каля Шварцвальдскага (Чорнага) возера. Запамяталася яно сваёй асаблівай чысцінёй і прыгажосцю. Мы наведалі таксама і Францыю. Цяпер гэта зрабіць лёгка, таму што граніцы паміж Германіяй і Францыяй ужо няма. Калі пераязджалі Рэйнскі мост, бачылі турыстаў, якія фатаграфавалі будынкі былой мытні. Мы жылі недалёка ад былой граніцы, таму асаблівай розніцы паміж гэтымі краінамі я не ўбачыла. Да Парыжа мы не даехалі, таму што гэта было далёка, а ў тых гарадах, якія мы наведалі, кідалася ў вочы адсутнасць ідэальнай чысціні, якую назіраеш ў Германіі. Што асабліва мяне ўразіла, дык гэта Страсбургскі мюнстр -- царква ў гатычным стылі, прыгажосць якой нельга апісаць словамі.

Былі мы і на нямецкіх дыскатэках. Яны там самыя розныя: музыка на любы густ і тэхна-, і дыска-, і поп-, і метал-, і інш. Ты ідзеш у тую дыскатэку, дзе іграюць тваю любімую музыку. Але на гэтых дыскатэках ёсць свае праблемы -- моладзь курыць наркотыкі.

Германію можна назваць свабоднай краінай, ад немцаў часта можна пачуць такі выраз: " Я – свабодны чалавек у свабоднай краіне і раблю тое, што мне падабаецца, калі гэта не разыходзіцца з законам".

Пасля вяртання дадому вельмі цяжка зноў прывыкнуць да акаляючых нас умоў. Усё, што там здавалася натуральным, тут становіцца праблемамі.

**І. ЛАПЫКА, студэнтка 3 курса спецыяльнасці "Нямецкая мова" філалагічнага факультэта.**

### Для першакурснікаў

## ПРАФСАЮЗ -- ВАШ АБАРОНЦА

Вам, сённяшнім першакурснікам, студэнцкае жыццё ўяўляецца пакуль што аднабакова: ведаеце, што вучоба -- асноўны ваш абавязак і занятак. А аб тым, што яшчэ чакае вас на працягу 5 гадоў, якія вы правядзеце ва універсітэце, уяўляеце слаба. Кажуць, што студэнцкія гады -- самыя лепшыя, цікавыя. Будуць у ім разнастайныя сустрэчы, конкурсы, канцэрты, а ў час канікулаў -- захапляючыя паездкі.

Шмат будзе залежыць і ад вас саміх, і ад грамадскіх арганізацый універсітэта. Сярод іх -- прафком студэнтаў, задачай якога з'яўляецца абарона інтарэсаў тых, хто стане членам прафсаюза адукацыі і навукі.

Прафсаюзы гарантуюць сацыяльную абарону сваім членам -- аказанне матэрыяльнай дапамогі, забеспячэнне пуцёўкамі для лячэння і аздараўлення і інш.

У нашым універсітэце прафкомам студэнтаў пры садзейнічанні рэктарата створаны Фонд сацыяльнай дапамогі студэнтам, які апякае не толькі сірот, маладыя сем'і, што маюць дзяцей, але прыходзіць на дапамогу маладому чалавеку ў любой складанай матэрыяльнай сітуацыі. Так, за першую палову бягучага года сума матэрыяльнай дапамогі студэнтам з гэтага фонда склала 37 млн. 40 тыс. руб.

Здароўе студэнцтва -- таксама клопат прафсаюза. Пуцёўкі на аздараўленне, лячэнне можна атрымліваць на час канікулаў, а згодна калектыўнаму дагавору студэнт мае права лячыцца ў санаторыі і ў час вучобы. Маладыя людзі, якія маюць патрэбу ў санаторна-курортным лячэнні, прымаюцца на ўлік у прафкоме на атрыманне пуцёвак па профілю свайго захворвання. У гэтым годзе зімой змаглі адпачыць у межах Беларусі 80 студэнтаў, атрымаць санаторнае лячэнне -- 45 чалавек, правесці лета на турбазах і ў дамах адпачынку, міжнародных маладзёжных цэнтрах рэспублікі, а таксама ў Крыме каля 40 юнакоў і дзяўчат. Многія атрымлівалі пуцёўкі бясплатна.

Можна папраўляць сваё здароўе таксама непасрэдна ў нас, на месцы, без выезду па пуцёўках у санаторыі і дамы адпачынку вобласці і рэспублікі. Ва універсітэце -- свая здраўніца, якая размяшчаецца побач з вучэбнымі карпусамі. У ёй ёсць неабходная лячэбная база -- 11 шматпрофільных кабінетаў з сучаснай апаратурай, абсталяваннем. Тут працуюць кваліфікаваныя медыкі і абслугоўваючы персанал. Санаторый-прафілакторый разлічаны на 100 чалавек, кошт пуцёўкі на 21 дзень -- 65% ад студэнцкай стыпендыі.

Такім чынам, студэнцкі прафсаюз робіць усё для таго, каб малады чалавек адчуваў клопат аб сабе.

**Н.КОЛТЫШАВА, старшыня прафкома студэнтаў.**



*СТРАЧАНЫ БЫЛЫЯ ТРАДЫЦЫІ*

# ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА НЕ АТРЫМАЛАСЯ

Жыццё наша цяпер надзвычай непрадказальнае. У любы момант можна чакаць ад яго самых розных сюрпрызаў. І часцей за ўсё, на жаль, непрыемных, нават надзвычайных. Заплануе чалавек, скажам, адно, а на самой справе атрымае зусім іншае.

Гэтым летам многія юнакі і дзяўчаты універсітэта хацелі папрацаваць у час канікулаў у складзе студэнцкіх атрадаў. Ім быў прапанаваны канкрэтны адрас -- Стаўрапольскі край, дзе на працягу ліпеня і жніўня студэнты маглі б працаваць на ўборцы гародніны і фруктаў. Карысць ад гэтага магла б быць двайной: і вітамінамі арганізм падмацуецца, і грашовую падтрымку атрымаеш. Але... Зноў жа гэтае "але". Трагічныя падзеі, якія разгарэліся летам на Стаўрапольшчыне, у г. Будзёнаўску, дзе чачэнскія тэрарысты трымалі ў трывозе і напружанні тысячы ні ў чым невінаватых мірных жыхароў, сталі прычынай адмовы кіраўніцтва універсітэта адпусціць студэнтаў ў гэты гарачы рэгіён. Такім чынам, тым, хто спадзяваўся паправіць сваё фінансавае становішча з дапамогай уласнай працы, нічога не заставалася як сядзець дома. А альтэрнатыўнага выбару для працы сёлета ў іх не было.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

*СПОРТ*

# ВЫПРАБАВАННІ ПЕРАД АЛІМПІЯДАЙ

Летнія канікулы для асноўнай масы студэнтаў -- пара актыўнага адпачынку. Для выхаванцаў жа факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта гэта быў адказны спартыўны сезон. Як вядома, у наступным годзе адбудуцца чарговыя Алімпійскія гульні ў Атланце. Каб заваяваць права ўдзельнічаць у іх, трэба быць як мінімум у тройцы мацнейшых на чэмпіянатах і Кубках свету. З мая па верасень г.г. праходзілі розныя спаборніцтвы.

Студэнты факультэта фізічнай культуры ГДУ дастойна выступалі на міжнароднай арэне.

У сталіцы Даніі Капенгагене разыгрываўся Кубак Еўропы сярод жаночых клубных каманд па лёгкай атлетыцы. За зборную Гомельшчыны ў гэтых прэстыжных спаборніцтвах выступалі Алена Бычкоўская, Наталля Салагуб, Наталля Сазановіч, Юлія Паспелава, Таццяна Гулевіч, Алена Лемяшэўская.

У Германіі праведзены чэмпіянат свету па веславанню. Выступаючы ў чарговым этапе Кубка свету, Мікалай Хільман і Дзмітрый Жукоўскі сталі другімі прызёрамі і ўпершыню выканалі нарматыў майстра спорту міжнароднага класа Рэспублікі Беларусь.

24-25 чэрвеня ў горадзе Вільнеў д"Аск (Францыя) разыгрываўся Кубак Еўропы па лёгкай атлетыцы. У складзе зборнай каманды Беларусі выступалі і нашы спартсменкі. У фінальным забегу на 1500 м Алена Бычкоўская паказала даволі высокі вынік -- 4.10,79 і заняла пятае месца. Наталля Салагуб выступала ў эстафеце 4х100 м.

## ХРОНІКА ПАСПЯХОВЫХ СТАРТАЎ

Наш квартэт заняў сёмае месца.

29-30 чэрвеня ў горадзе Хельмонт (Галандыя) за Кубак Еўропы змагаліся шматборцы. Гонар Беларусі абаранялі і нашы студэнткі. Каманда была ўкамплектавана толькі гамяльчанкамі. Анжэла Атрошчанка, Тамара Алісіевіч і Наталля Сазановіч вярнуліся на радзіму з перамогай і ганаровым трафеем, апярэдзіўшы моцныя каманды Германіі і Расіі. Менш паспяхова выступілі мужчыны. Юрый Лекуновіч і Максім Марыненка занялі агульнае шостае месца, што дало ім права ў наступным годзе выступаць у вышэйшай лізе.

7-8 ліпеня на гомельскім стадыёне "Прамень" праходзіў адкрыты чэмпіянат па лёгкай атлетыцы. Парадавала балельшчыкаў Таццяна Гулевіч. У скачках у вышыню яна пераадолела 192 см, заваявала вышэйшую ўзнагароду і выканала нарматыў майстра спорту міжнароднага класа. Дзве вышэйшыя ўзнагароды на рахунку Алены Бычкоўскай. Яна была мацнейшай на дыстанцыях 800 і 1500 м. На гэтых дыстанцыях Анатоль Буткоўскі заваяваў адпаведна сярэбраны і залаты медалі. Дзве ўзнагароды дасталіся і Аляксандру Цітову: залатая -- у бегу на 400 м, бронзавая -- на дыстанцыі ўдвая даўжэйшай.

З 6 па 10 ліпеня ў Тэгеране праходзіў чэмпіянат свету сярод юніёраў па грэка-рымскай барацьбе. Пераможцам у сваёй вагавай катэгорыі стаў другакурснік Сяргей Макаранка. Ён таксама ўпершыню выканаў нарматыў майстра спорту міжнароднага класа РБ. У тым жа месяцы на працягу чатырох дзён у Мінску праходзіў адкрыты розыгрыш Беларусі па паліатлону. Наша Таццяна Аляксухіна стала пераможцай і ўпершыню выканала нарматыў майстра спорту. Такога ж запаветнага рубяжа дасягнулі яшчэ дзевяць студэнтаў факультэта фізічнай культуры: С.Вераксіч -- па веславанню на байдарках і каноэ, А.Захарчанка, С.Драпкоў -- па вольнай барацьбе, В.Каваленка -- па грэка-рымскай барацьбе, А.Собаль, С.Квашнін -- па фехтаванню, А.Слюнькоў, В.Кандраценка -- па лёгкай атлетыцы.

14-18 ліпеня ў Тэгеране праходзіла першынство свету па вольнай барацьбе сярод юніёраў. Тут перамогі дабіўся студэнт першага курса Мікалай Савін. Перамога дала яму права на прысваенне ганаровага звання майстра спорту міжнароднага класа РБ. Другім прызёрам на турніры асілкаў стаў другакурснік А.Захарчанка. 18-20 жніўня ў Швейцарыі за званне чэмпіёнак свету змагаліся па сучаснаму пяцібор"ю жанчыны. Сярэбраны медаль заваявала наша Жана Шубянок. Спартыўны сезон спартсмены ГДУ заканчваюць на мажорнай ноце, каб з гонарам прадставіць Рэспубліку Беларусь на Алімпійскіх гульнях у Атланце.

**В.ЛЕМЯШКОЎ, дырэктар спартклуба, кандыдат педагагічных навук.**

**І жартам, і ўсур'ёз**

## У СЛОЎНІК ПЕРШАКУРСНІКА

АЎДЫТОРЫЯ -- зала, ў якой чытаюцца лекцыі; зборная назва слухачоў лекцыі.

Падзяляюцца на шчаслівыя і нешчаслівыя. Калі вы спазніліся і не адважваецеся ўвайсці, не хвалюйцеся, кантакт паміж вамі і выкладчыкамі можа быць устаноўлены з дапамогай дзіркі ў дзвярах, прасвідраванай умелымі старшакурснікамі і якая засталася цэлай і не пашкоджанай (вось цуд!) нават пасля рамонту.

ДЭКАНАТ -- адміністрацыйна-вучэбнае ўпраўленне факультэта, якое ўзначальваецца дэканам.

Гэта адзінае месца, дзе студэнт можа стаяць вельмі доўга і цярпліва чакаць. У пачатку вучобы -- па асабістым жаданні, у канцы вучобы -- таксама па асабістым жаданні ... дэкана.

КУРАТАР -- папячыцель, апякун.

Уявіце сабе класнага кіраўніка, які на вас не сварыцца, не прымушае ўбіраць памяшканне, не ... не ... не ... Гэта і будзе куратар.

### СТУДЭНЦКІ ГУМАР

У інстытуце:
-- Не магу паверыць, што вы закончылі сярэднюю школу!
-- Хіба ў мяне так шмат памылак?
-- У тым і справа, што ў вас няма ніводнай памылкі!

* * *

У мяне пяць дачок-студэнтак.
-- Напэўна, цяжка пракарміць і апрануць пяцёра дзяцей?
-- Не пяцёра, а васьмёра -- трое з іх выйшлі замуж за студэнтаў.

* * *

Студэнт піша маці:
"Мамачка, вышлі мне, калі ласка, цёплыя шкарпэткі, але толькі загарні іх так, каб яны не сапсаваліся ад сала і каўбасы".

* * *

Фатограф рыхтаваўся сфатаграфаваць бізнесмена з сынам-студэнтам.

-- Вы сядайце вось у гэтае крэсла, а ты, сынок, станавіся побач і пакладзі руку на татава плячо.

-- А ці не будзе поза больш натуральнай, -- перапыніў яго бізнесмен, -- калі ён пакладзе руку ў маю кішэню.

* * *

-- Як вам не сорамна! Студэнта-механіка пасадзілі паліто здымаць!

-- Ну і што тут такога? Хіба гэта работа не механічная?

## Из летних странствий возвратясь

**Алла БРЕДИХИНА,**
**студентка заочного факультета.**

### РОДНОЕ

*Свежесть соленого ветра,*
*Плещет морская волна.*
*Светлая память лета*
*Меня возвращает сюда.*

*Темные глыбы -- горы.*
*Солнца кровавый закат.*
*Будет ли радость иль горе --*
*Мысли сюда летят.*

*Но только наступит лишь лето,*
*И я вновь поспешу на юг.*
*Я снова увижу все это*
*И тут затоскую вдруг*

*По шалуньям-березкам зеленым,*
*По луга цветному ковру,*
*По гордым красавцам кленам.*
*Я вспомню озер синеву.*

*Я вспомню дубы могучие,*
*Живущие сотни лет.*
*И тут я пойму, что лучше*
*Родного на свете нет.*



*Первый утренний луч прикоснётся*
*Робко к нежным вершинам берёз,*
*И туманная мгла всколыхнётся,*
*На траву обронив капли рос.*

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**
**імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
-- геаграфіі -- дацэнта;
-- нямецкай і французскай моў -- выкладчыка;
-- геафізікі -- дацэнта;
-- матэматычных праблем кіравання -- дацэнта;
-- тэорыі і методыкі фізічнай культуры -- дацэнта;
-- матэматычнага аналізу -- асістэнта;
-- хіміі -- асістэнта;
-- інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі -- ст. выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

У дні летніх канікулаў, калі не выходзіла наша газета, трагічна абарвалася жыццё намесніка старшыні прафкома студэнтаў **ПЫШНЯКА Яўгена Васільевіча** і заўчасна памёр загадчык кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры кандыдат педагагічных навук, прафесар **СЕМІКОП Арнольд Фёдаравіч.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта выказалі сем'ям і родным нябожчыкаў сваё глыбокае спачуванне.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектывы дэканатаў гісторыка-юрыдычнага факультэта, біяфака, кафедры філасофіі выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту **ГАРАНІНАЙ Тамары Пятроўне** ў сувязі з напаткаўшым яе горам -- смерцю **МАЦІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул, Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул.Савецкая, 1.

За нядкасны набор, вёрстку і памылкі фабрыка "Палесдрук" адказнасці не нясе.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 478
Падпісана да друку 28.08.95.